ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!
МЫ НАЎМЫСНА ЗАТРЫМАЛІ ВЫДАНЬНЕ ГЭТАГА НУМАРУ, ТАМУ НЕ КРЫЎДУЙЦЕ, ШТО ЕН ТРАПІЎ ДА ВАС У КРАСАВІКУ. У МЕЖАХ ІСНУЮЧЫХ МАГЧЫМАСЬЦЯЎ НАМ ХАЦЕЛАСЯ НЯ ТОЛЬКІ НАГАДАЦЬ ВАМ ПРА ДЗЕНЬ ВОЛІ, АЛЕ Й РАСПАВЕСЬЦІ ПРА ЯГО СЬВЯТКАВАНЬНЕ НА БЕЛАРУСІ.

№48
САКАВІК
2009

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Дзень Волі ў Магілёве



На Дзень Волі грамадзкія актывісты Магілёва зладзілі акцыю ля Краязнаўчага музэю. У гэтым будынку ў 1918 годзе прадстаўнікі грамадзкасьці прызналі ўладу БНР.

Акцыя пачалася а 18-ай гадзіне. Да будынку прыйшлі некалькі дзясяткаў грамадзкіх актывістаў. Магілёўцы прычапілі да вопраткі бел-чырвона-белыя стужкі ды віншавалі адзін аднаго з Днём Волі. Затым удзельнікі акцыі ўсклалі кветкі да створанай дэмакратамі шыльды ў гонар БНР. Пасьля чаго ля ўваходу ў музэй адбыўся непрацяглы мітынг, які завершыўся воклічам “Жыве Беларусь!”. За акцыяй назіралі чацьвёра міліцыянтаў. Адзін зь іх падышоў да актывіста Руху "За Свабоду", кіраўніка Магілёўскай філіі Партыі БНФ Рыгора Кастусёва, каб пацікавіцца, хто арганізаваў акцыю.

Паводле гісторыкаў, менавіта ў будынку Краязнаўчага музэю 12 ліпеня 1918 году зь ініцыятывы Магілёўскага нацыянальнага камітэту адбыўся сход з удзелам прадстаўнікоў магілёўскай грамадзкасьці. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел каля чатырохсот чалавек. Большынёй галасоў удзельнікі сходу падтрымалі



абвяшчэньне незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Летась моладзевыя актывісты зьбіралі подпісы за ўсталяваньне на будынку Краязнаўчага музэю інфармацыйнай шыльды ў гонар Беларускай Народнай Рэспублікі. Усяго было сабрана некалькі сотняў подпісаў магілёўцаў. Аднак гарвыканкам ініцыятывы не падтрымаў – чыноўнікі спаслаліся на нібыта адмоўнае стаўленьне музэйных супрацоўнікаў ды на адсутнасьць дакумэнтальнага пацьверджаньня гістарычнай падзеі.

№48 САКАВІК 2009 Выбар

# Старонка нашай гісторыі

*У час майго студэнцта лекцыі па гісторыі Беларусі на гістарычным факультэце БДУ чытаў прафесар, Член-карэспандэнт АПН СССР Лаўрэнцій Сямёнавіч Абецэдарскі (дарэчы, ураджэнец г. Горкі). Лектар быў выдатны, але падзеі, звязаныя з 25 сакавіка, падаваў вельмі павярхоўна і так, як патрабавала афіцыйная ідэалагічная установка правячай у той час камуністычнай (былой бальшавіцкай) партыі. А ўстаноўка была вельмі простай: бальшавікі аб'яўлялі варожым усё, што не супадала з іх палітычным курсам. Ды і ў нашыя дні гэтая дата ў адных выклікае пачуццё гонару, у іншых – катэгарычнае непрыняцце. Узнікаюць пытанні: што было і чаму так?*

*Пры таталітарных і аўтарытарных рэжымах гістарчная навука заўсёды была пад асаблівым наглядам. За савецкім часам у беларускую гісторыю ўбівалася найбуйнейшая фальсіфікацыя, што да стварэння бальшавікамі ў 1919 г. БССР, беларусы ніколі не мелі сваёй дзяржаўнасці. Ні Полацкае і іншыя княствы на тэрыторыі сучаснай Беларусі, ні Вялікае Княства Літоўскае да ўвагі не прымаліся. Асабліва настойліва вытручвалася памяць аб створанай у сакавіку 1918 г. Беларускай Народный Рэспубліцы. Бальшавікі і іх прыхільнікі, усе, хто зацікаўлены ў тым, каб беларусы страцілі сваю гістрарычную памяць, імкнуліся не дапусціць прызнанне таго, што беларускія патрыёты у неймаверна складаных умовах здолелі стварыць новую беларускую дзяржаву і тым самым узвысілі беларусаў як нацыю.*

*Але ж факты, як кажуць,– рэч упартая і што рабіць, калі яны становяцца вядомымі? Прыёмы вядомыя: калі ёсць факты, то тым горш для фактаў. Іх трэба так падаць альбо абліць брудам, каб яны не выклікалі даверу.*

*Непасрэдна на гісторыю БНР былі накіраваны такія тэзісы: быццам бы, БНР – гэта палітычны і гістарычны міф, на самой справе яна не існавала; тое, што мела назву БНР – гэта стварэнне нямецкіх акупантаў пазбаўленае ўсялякай самастойнасці; старальнікі і дзячы БНР – гэта беларускія нацыяналісты, здраднікі і ворагі беларускага народа (напрыканцы 1920-х гг. у СССР быў нават уведзены тэрмін "нацдэм" – нацыянальны дэмакрат, абвінавачванне ў "нацдэмаўшчыне" непазбежна вяло да самага страшнага прысуду ).*

*Трэба прызнаць, што за апошнія гады ў адносінах да БНР адбыліся пэўныя змены.*

*Давайце і мы паглядзім больш разважліва на тую старонку нашай гісторыі, якая і сёння для многіх застаецца не вельмі добра вядомай*

25 кастрычніка 1917 года бальшавіцкая партыя начале з У.Леніным стала правячай. Каб прыцягнуць на свой бок прадстаўнікоў народаў шматнацыянальнай Расійскай Імперыі, бальшавікі абяцалі прадаставіць нацыям права самім вызначаць свой лёс і нават права аддзяліцца ад Расіі і стварыць свае асобныя дзяржавы.

Па Беларусі ў гэты час праходзіла лінія фронту Першай сусветнай вайны. На незанятай немцамі тэрыторыі Беларусі бальшавікі стварылі вышэйшы орган савецкай улады – Абласны выканаўчы камітэт саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (скарочана – Аблвыкамзах). Паглядзіце: у доўгай назве няма нават напаміну пра Беларусь. Заходняя вобласць (ў межах Савецкай Расіі) і ўсё. У складзе Аблвыкамзаха амаль не было беларусаў. Яго кіраўнікі – В.Кнорыньш, К.Ландэр, А.Мяснікян – як яны самі прызнавалі, не лічылі беларусаў за нацыю. І гэтыя дзеячы (!) падаюцца абаронцамі беларусаў, а ў сталіцы іх імёнамі названы вуліцы і плошчы.

У такіх умовах беларускія патрыятычныя арганізацыі імкнуліся ўтварыць такую ўладу, якая б забяспечвала прадстаўніцтва ад розных палітычных сілаў Беларусі. Дзеля гэтага быў скліканы Першы Ўсебеларускі з'езд,.

Скліканне з'езда ад імя ўрада Расіі падтрымаў І.Сталін – народны камісар (міністр) па справах нацыянальнасцяў. Было ўзгоднена, што ўлада на Беларусі павінна належаць краёваму Савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў, выбранаму на краёвым з'ездзе.

Да 14 снежня 1917 г. у Мінск з'ехаліся 1872 дэлегаты. Быў абраны прэзідыум і утвораны Савет з'езда, які стаў кіруючым органам. Але 17 снежня бальшавікі разагналі з'езд.

Узнікае пытанне: за што?

За тое, што з'езд пастанавіў "выдзеліць са свайго складу орган краёвай улады ў выглядзе Усебеларускага савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў" і даручыў яму "кіраванне Беларуссю да склікання Беларускага ўстаноўчага сейма".

Звярніце ўвагу, з'езд не выступіў супраць савецкай улады. Наадварот: улада перадавалася "Усебеларускаму савету сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў" і гэты пункт адпавядаў дамоўленасцям са Сталіным.

Дык што так напалохала бальшавіцкіх лідэраў Аблвыкамзаха?

А тое, што іх ўлада абмяжоўвалася: Аблвыкамзах павінен быў займацца франтавымі справамі. Агульнае кіраўніцтва часова пераходзіла да названага вышэй Савета. Потым дэмакратычным шляхам, праз выбары, прадугледжвалася скліканне Беларускага ўстаноўчага сейма. Бальшавікі не былі ўпэўнены, што яны атрымаюць большасць пры сапраўды дэмакратычных выбарах. Тут яскрава праявілася іх імкненне да аднапартыйнай дыктатуры.

Пасля разгону з'езда частка яго дэлегатаў сабралася ў чыгуначным дэпо і 18 (31) снежня 1917 г. было прынята рашэнне аб перадачы краёвай улады Радзе Усебеларускага з'езда. 21 снежня 1917 г. Рада Усе-

беларускага з'езда абрала са свайго складу Выканаўчы камітэт з 10 чалавек.

Такім чынам, Выканаўчы камітэт стаў законным (легітымным) упаўнаважаным органам І Усебеларускага з'езда.

Далей падзеі разгортваліся наступным чынам.

Перагаворы савецкага ўрада з немцамі поспеху не мелі. 18 лютага 1918 г. немцы зноў пачалі наступленне і Аблвыкамзах 19 лютага ўцёк у Смаленск.

З гэтага дня парадак у Мінску падтрымлівалі беларускія сілы. Выканкам Рады Усебеларускага з'езда, які выйшаў з падполля, абвясціў сябе найвышэйшай уладай на Беларусі і вылучыў са свайго складу першы беларускі ўрад – Народны Сакратарыят Беларусі начале з Язэпам Варонкам. Аб гэтым 21 лютага паведамлялася ў Першай устаўнай грамаце да народаў Беларусі. Аднак незалежнасць Беларусі яшчэ не была абвешчана.

Пазней у Мінску з'явіліся немцы. Яны былі акупантамі і поводзілі сябе як акупанты. 25 лютага выгналі з памяшкання Народнага Сакратарыята служачых, сарвалі бел-чырвона-белы сцяг. Аднак у выніку перамоваў 28 лютага нямецкая ваенная адміністрацыя дазволіла дзейнасць Народнага Сакратарыята.

Заняўшы тэрыторыю да Дняпра, немцы па прапанове Расіі зноў пайшлі на перагаворы і 3 сакавіка 1918 г. у Брэсце паміж Расіяй і Германіяй быў падпісаны трактат аб міры (Брэсцкі мір). Пра Беларусь і не згадвалі, яе тэрыторыю сталі расцягваць суседнія краіны.

Абразлівае стаўленне да Беларусі выклікала новы выбух нацыянальнай свядомасці. 9 сакавіка 1918 г. Выканкам Усебеларускага з'езда прыняў Другую ўстаўную грамату, па якой наша краіна абвяшчалася Беларускай Народнай Рэспублікай. Выканкам Усебеларускага з'езда быў пераўтвораны ў Раду БНР, якая атрымлівала заканадаўчую ўладу (старшыня – Іван Серада). Выканаўчай уладай (урадам БНР) стаў Народны Сакратарыят (старшыня – Язэп Варонка).

Другая устаўная грамата сцвярджала сацыялістычныя прынцыпы, шанавала правы нацыянальных групаў, касавала прыватную ўласнасць на зямлю, якая пера-



давалася тым, хто на ёй працаваў, уводзіла васьмігадзінны працоўны дзень. У БНР ніхто не пазбаўляўся права выбіраць і быць абраным. Была абвешчана свабода слова, друку, сходаў, забастовак, саюзаў, "безумоўная вольнасць сумлення", недатыкальнасць асобы і жылля.

Забаранялася вайна супраць рэлігіі і ўсялякая цэнзура.

БНР паўставала як дэмакратычная сацыялістычная дзяржава.

Насуперак стандартным абвінавачванням савецкіх часоў, што БНР – гэта стварэнне нямецкіх акупантаў, немцы да фармавання вышэйшых дзяржаўных структураў Беларусі ніякага дачынення не мелі. Чальцы Рады і ўрада БНР былі прадстаўнікамі беларускага народа, абранымі на І Усебеларускі з'езд яшчэ ў снежні 1917 г.

Каб вызначыць адносіны з іншымі дзяржавамі, 23 сакавіка 1918 г. А.Луцкевіч прапанаваў Народнаму сакратарыяту абвясціць незалежнасць БНР.

25 сакавіка 1918 г. на пасяджэнні Рады была прынята Трэцяя ўстаўная грамата, у якой абвяшчалася незалежнасць БНР. У хуткім часе БНР прызналі Украіна, Літва, Латвія, Эстонія, Фінляндыя, Чэхаславакія. Консульствы БНР былі адкрыты ў Германіі, Польшчы, Даніі, Турцыі і Расіі.

БНР выдавала сваім грамадзянам беларускія пашпарты, зацвердзіла ў якасці дзяржаўнай нацыянальную сімволіку: свой дзяржаўны герб – "Пагоню" (узброены рыцар на кані) і свой дзяржаўны бел-чырвона-белы сцяг. 12 красавіка 1918 г. Народны Сакратарыят БНР прыняў пастанову аб абвяшчэнні беларускай мовы дзяржаўнай і абавязковай для грамадзян рэспублікі.

Значных поспехаў БНР дасягнула ў развіцці асветы і культуры. Паводле розных падлікаў, працавалі ад 150 да 350 школаў. Падрыхтоўка настаўнікаў вялася ў Свіслацкай семінарыі і Мінскім педінстытуце. У красавіку 1918 г. была заснавана Мінская вышэйшая музычная школа, якая неўзабаве пераўтварылася ў Беларускую кансерваторыю. У красавіку 1918 г. была створана камісія для адкрыцця Беларускага універсітэта ў Мінску, у якую ўвайшлі А. Смоліч, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі і інш. У 1918 г. была створана першая беларуская навуковая ўстанова – Беларускае навуковае таварыства ў Вільні. Выдаваліся беларускія кнігі, часопісы і газеты.

Як сведчанне растучага аўтарытэту БНР можна разглядаць той факт, што па запрашэнні У.Леніна новы кіраўнік урада БНР А.Луцкевіч у лістападзе 1918 г. наведаў Маскву з мэтай нармалізаваць двухбаковыя адносіны. Аднак менавіта ў гэтыя дні стала вядома аб рэвалюцыі ў Германіі і яе капітуляцыі ў вайне. Бальшавікі зноў вярнуліся да сваёй ідэі сусветнай камуністычнай рэвалюцыі, а БНР у гэтым ім толькі перашкаджала. Былі перапынены ўсялякія кантакты з БНР. Савецкая Расія не прызнала незалежнасці нашай краіны і 17 лістапада Чырвоная Армія пачала наступ на Беларусь. 10 снежня чырвонаармейцы захапілі Мінск, а 5 студзеня 1919 г. – Вільню.

Рада і ўрад БНР, каб не быць арыштаванымі, мусілі выехаць з Мінска ў Гродна, а пасля ў эміграцыю.

Галоўнай заслугай дзейнасці ўрада БНР было тое, што ён азнаёміў грамадскасць суседніх краін з наяўнасцю беларускага нацыянальнага руху, акрэсліў этнічныя межы Беларусі, прадухіліў яе падзел паміж суседнімі дзяржавамі (Расіяй, Польшчай, Украінай, Літвой) як "нічыйнай" тэрыторыі. Пасля шматгадовага уціску і прыніжэння беларусы паўсталі як еўрапейскі народ, які абвясціў сваё гістарычнае права на месца пад сонцам.

Вось чаму дзень 25 сакавіка, незалежна ад таго, як хто да яго адносіцца, назаўсёды ўвайшоў у беларускую гісторыю як дзень, калі беларусам удалося стварыць не проста беларускі ўрад, а Беларускую Народную Рэспубліку.

***А.Каданчык,***
***кандыдат гістарычных навук.***

# Виктор Ивашкевич: «Провокации властей в День Воли провалились»

Участники акции в День Воли не поддались на провокации властей, считает один из организаторов демонстрации, заместитель председателя Партии БНФ Виктор Ивашкевич.

«Я считаю, что демонстрация людей, для которых День Воли является праздником независимости, удалась. Участников акции было меньше, чем читателей независимой прессы и активных на форумах, но в целом демонстрация прошла успешно», - заявил Виктор Ивашкевич в интервью пресс-центру Хартии '97.

По мнению политика, демонстранты добились успеха, поскольку не поддались на провокацию властей, и акция прошла без столкновения людей с ОМОНом.

«Нам удалось добиться того, что люди не поддались на провокацию властей, и обошлось без разгона демонстрации силовыми структурами. Чувствовалось единство. Люди делали то, что предлагали организаторы акции. Основная масса участников акции выстроилась в цепочку по направлению к Национальной библиотеке, люди стояли с транспарантами, и получилась настоящая демонстрация. Часть людей попыталась пройти к Октябрьской площади, но власти бросили против мирных демонстрантов сотни сотрудников ОМОНа. Хорошо что все участники акции не пошли на реализацию плана властей. Оппозиционеры доказали, что действуют исключительно мирным, ненасильственным способом», -- сказал Виктор Ивашкевич.

Виктор Ивашкевич также подчеркнул, что машину со звукоусиливающей аппаратурой, задержанную в начале акции, пропустили на площадку возле Академии наук только после того, как о задержании стало известно представителям посольств стран Евросоюза.

«В самом начале акции аппаратуру задержали сотрудники ГАИ. Но, насколько я знаю, после того, как об этой провокации стало известно представителям европейских посольств, наблюдавших за демонстрацией, звукоусиливающую аппаратуру пропустили», - отметил зампредседателя Партии БНФ.

«После акции я видео много автозаков и автобусов с милицией. Власти планировали разгон», - пояснил политик.

# Выкладчыцу звольнілі з-за БНР

Выкладчыца адукацыйнага цэнтру SOL Minsk Марыяна Грузьдзіловіч звольненая з працы за тое, што распавяла навучэнцам пра Дзень волі.

Як паведамляе Хартыя-97, адна з навучэнак сказала, што ведае, што такое Дзень волі – "гэта калі адмарозкі зьбіраюцца і пачынаюць крычаць". Пасьля гэтага Марыяна Грузьдзіловіч распавяла дзецям, што гадавіну ўтварэньня Беларускай Народнай Рэспублікі сьвяткуюць інтэлігентныя людзі, якія ладзяць мірныя акцыі.

На наступны дзень са спадарыняй Грузьдзіловіч сустрэліся кіраўнікі цэнтру, якія заявілі пра яе звальненьне. Як выявілася, дзяўчына, якая падала рэпліку пра "адмарозкаў", паскардзілася бацьку, палкоўніку МУС.

Кіраўніцтва таксама паведаміла Марыяне Грузьдзіловіч, што бацькі навучэнцаў напісалі калектыўную скаргу на тое, што ў цэнтры адбываецца агітацыя за апазыцыю.

*Радыё Свабода*

## З ДНЁМ ВОЛІ, ГОРКІ!

Сямёра актывістаў правялі святочную акцыю на тэрыторыі Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Яны раздалі студэнтам спецвыпуск газеты "Горацкі выбар", прысвечаны абвяшчэнню незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, і віншавальныя паштоўкі.

"Мы пачалі сваю акцыю а палове на восьмую, калі студэнты ішлі на заняткі. За гадзіну мы раздалі каля дзвюх тысяч адзінак друкаванай прадукцыі. Студэнты ахвотна разбіралі нашыя святочныя гасцінцы. Яны жыва рэагавалі на артыкул былога выкладчыка акадэміі, кандыдата гістарычных навук Аляксандра Каданчыка. У ім гісторык выклаў сваё бачанне падзеяў, звязаных з абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі, а таксама на тое, чым ёсць БНР для сённяшняй Беларусі",- паведаміў пра акцыю яе з яе ўдзельнікаў.

Інцыдэнтаў з адміністрацыяй акадэміі й міліцыяй за час акцыі не было.

## ПАВІНШАВАЛІ ЎЛАДОЎЦАЎ

Горацкія й бялыніцкія актывісты апазыцыі павіншавалі кіраўнікоў сваіх райвыканкамаў з Днём Волі.

У Горках віншавальную паштоўку старшыні раённай вэртыкалі Міхаілу Анікееву актывісты прынесьлі самі, а ў Бялынічах Аляксандру Вароніну даслалі заказным лістом.

Паводле горацкага актывіста Эдуарда Брокарава, спадара Анікеева ня толькі паштоўкай павіншавалі з 91-й гадавінай абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, але й нагадалі, што менавіта гэтая падзея сталася штуршком да стварэньня бальшавікамі Савецкай Беларусі. Акрамя таго, без БНР не было б сёньняшняй незалежнай Беларусі.

Паводле бялыніцкага актывіста Барыса Вырвіча, спадара Вароніна таксама павіншавалі з Днём Волі й пажадалі яму ў Год зямлі плённай працы па адраджэньні культурных і матэрыяльных каштоўнасьцяў беларускага народу.

*Радыё Свабода (Магілёў)*

# Мілінкевіч: Наша задача – вяртаць людзей з таталітарнага грамадзтва ў свабоднае

На прэс-канферэнцыі лідэры Руху "За Свабоду" распавялі пра адзначэнне Дня Волі, сваю ацэнку ўзаемадачыненняў Беларусі і Еўразвязу, а таксама пра планы на далейшую дзейнасць.

Аляксандр Мілінкевіч адзначыў, што праграма Ўсходняга партнёрства з'яўляецца вельмі важным крокам насустрач Беларусі. Еўрапейскія лідэры схіляюцца да палітыкі "дазаванага перніка", які можа мець добрую перспектыву. Яна дазволіць нашай краіне наладзіць эфектыўнае супрацоўніцтва не толькі з ЕЗ. але і з іншымі пяццю краінамі-партнёрамі. На думку лідэра Руху "За Свабоду", у перспектыве Беларусь разам з Украінай і Малдовай можа атрымаць шанец на ўступленне ў Еўразвяз.

Еўрапейскія палітыкі ведаюць сапраўдны стан з правамі чалавека ў Беларусі, але на іх думку далучэнне краіны да праграмы "Усходняга партнёрства" паспрыяе і палітычным зменам. Супрацоўніцтва будзе абумоўлена прагрэсам на шляху дэмакратызацыі. Прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі ставіць пад пагрозу шанс на Еўраінтэграцыю.

На думку Аляксандра Мілінкевіча, захоўваючы добрыя партнёрскія стасункі з аб'яднанай Еўропай, Рух павінен весці няспынную працу з грамадзянамі сваёй краіны. Людзі мусяць ведаць пра перавагі еўрапейскага выбару для краіны і актывісты арганізацыі будуць працаваць у гэтым накірунку. Дамагчыся свабодных і справядлівых выбараў можна толькі абапіраючыся на народную падтрымку.

– Беларусь зараз перад геапалітычным выбарам. Зараз існуе вялікая пагроза для незалежнасці Беларусі. Самае галоўнае для нас – змаганне за Беларусь. Каб наша краіна не знікла і абрала еўрапейскі шлях развіцця. Наш уплыў на разуменне людзьмі пакуль невялікі. Наша задача – вяртаць людзей з таталітарнага грамадства ў грамадства свабоднае, – лічыць лідэр Руху "За Свабоду"


Фота з архівфа

Па словах Віктара Карнеенкі, Еўропа не вырашыць за нас пытанні дэмакратыі ў Беларусі. Гэта марныя спадзяванні часткі дэмакратычнага грамадства. Па сутнасці апазіцыі сёння трэба вырашаць пытанне свайго ўдзелу ў дыялогу паміж Беларуссю і Еўропай: быць яго ўдзельнікамі, альбо ацэншчыкамі. Мы выбіраем першае.

– Працэс марудная еўраінтэграцыі Беларусі можа і наогул спыніцца. У гэтым сэнсе нас непакояць апошнія тэндэнцыі: зрыў сустрэч еўрапейскіх палітыкаў з уладамі, іх некаторыя публічныя заявы. Беларускія палітыкі павінны больш адказна ставіцца да гэтага працэсу, лічыць Віктар Карнеенка.

Пазіцыю Руху "За Свабоду" наконт святкавання Дня Волі, выказаў Юрась Губарэвіч:

– Нашы актывісты адзначаюць свята ў больш чым 20 гарадах Беларусі. Гэта ўшанаванне памяці дзеячаў БНР і герояў змагання за свабоду і незалежнасць Беларусі, вывешванне нацыянальных сцягоў, прэзентацыі кніг, вечарыны, дыктоўкі і іншыя мерапрыемствы. Яны маюць за мэту распаўсюд нацыянальных каштоўнасцяў сярод незаангажаваных людзей. Нашы актывісты будуць таксама ўдзельнічаць у адзначэнні свята ў Мінску.

Юрась Губарэвіч таксама паведаміў журналістам пра тое, што на красавік рыхтуецца серыя паездак лідэра Руху "За Свабоду" па рэгіёнах. Іх мэта наладзіць ці аднавіць кантакты з актывістамі, знайсці новых прыхільнікаў. Па словах Губарэвіча цяперашні статус Руху і канкрэтныя прапановы з боку Еўропы даюць больш магчымасцяў для папулярызацыі каштоўнасцей еўрапейскага выбару.

№48 САКАВІК 2009 Выбар

# «Подскажите, куда обратиться...»

Некогда один известный писатель выразился почти что афористично: «Квартирный вопрос испортил москвичей». Фраза запомнилась вначале читающей публике, а потом разошлась по литературе и кино. И вот прошли многие и многие десятилетия, но она до сих пор на устах. Разумеется, цитируется крылатое выражение без всякой связи с «испорченными» москвичами. Дело, собственно, не в них, а в том, что квартирный вопрос до сего дня не получил положительного ответа для весьма значительного количества наших сограждан.

Конечно, если взять отчёты Минстата, то жилищная проблема начинает казаться как минимум надуманной, как максимум — практически решённой. Согласно статистическим данным у нас ежегодно вводятся миллионы квадратных метров жилплощади. Непонятно одно, как при таких темпах кто-то ещё остаётся без своего угла. Если же от отчётов вернуться в реальность, то обнаружишь, что сегодня в очереди на получение долгожданных метров годами стоят сотни тысяч людей.

Реалистично осмыслить пресловутый квартирный вопрос могут помочь даже те издания, которые по ряду причин предпочитают писать про успехи жилищного строительства в одном социально ориентированном государстве народного благоденствия. В потоке газетного восхвалямса и одобрямса нет-нет, да и прорываются отдельные публикации с совершенно иной тональностью. На некоторые из них нельзя не обратить внимание.

Вот, к примеру, письмо жительницы одного из агрогородков Климовичского района, присланное в редакцию газеты «Могилевские Ведомости». В её обращении звучит следующая просьба: «Подскажите, куда можно обратиться, чтобы хотя бы в течение года получить какое-нибудь жильё». Положение её незавидно, она одна воспитывает двух малолетних детей. Живут в двухкомнатной квартире с матерью и сестрой, у которой тоже двое детей. Это уже не квартира, а детский сад пополам с общежитием. На две комнаты — семь душ.

В сельсовете ей сразу по-честному сказали, что становиться на очередь не имеет смысла: «на жильё — большая очередь и за 10 лет новоселье справил всего один человек, и то инвалид». В редакции ситуация также не нашла разрешения, хотя к её обсуждению пытались привлечь специалистов. В качестве совета жительница агрогородка получила такую рекомендацию: «Теоретически быстрее и дешевле обзавестись жильём, устроившись на работу в местное хозяйство. Здесь возводится новая ферма, есть вакансия оператора машинного доения. В год строится 5 комфортабельных домиков. Так что, 4 - 5 лет и можно покупать собственную мебель».

Совет, конечно, очень правильно назван теоретическим. Каких-то четыре-пять лет и покупай, мать, собственную мебель. Если к этому времени «купило» не кончится и со всем остальным всё будет в порядке. А ведь с возрастом проблем меньше не становится. Вот ещё один крик души другой жительницы Климовичского района. Она тоже проживает в сельской местности, в агрогородке Родня. Обращение сельской пенсионерки к председателю республиканского КГК Зенону Ломатю напечатала областная газета «Зямля і людзі». Газета пишет, что бабушка проживает в 8-квартирном доме, который имеет 89% износа. Со слов пенсионерки: «На втором этаже, где я живу, обвалился потолок, проваливается пол. Всё лето я прожила в сарае, а теперь — холода, и я вынуждена спать в своей квартире, не зная, проснусь я утром, или ночью на меня обрушится крыша. Помогите!».

Мы привели всего два примера, выбрав те, которые имеют отношение к Климовичскому району. Понятно, что таких случаев гораздо больше, если людское «Помогите!» раздаётся уже со страниц государственных газет. Реальную ситуацию в сфере жилищного обеспечения граждан просто невозможно больше скрывать и замалчивать. Хотим мы этого или нет, но настало время задуматься, кто же испортил квартирный вопрос в нашей стране? Москвичи здесь, во всяком случае, абсолютно не при чём.

*Сергей Аржанцев (Климовичи)*

БАБРУЙСК

## ЗНОЙДЗЕНЫ МІНІ–СПІРТОВЫ ЗАВОД

Пяцьсот літраў брагі, восем літраў самагонкі і шэсць самагонных апаратаў знайшлі ў кватэры непрацуючага 45 гадовага бабруйчаніна, які пражывае па вуліцы Батава.

— Каб у адной кватэры — міні–спіртовы завод?! Такое ў маёй практыцы ўпершыню за 4 гады, — здзіўлены старэйшы інспектар упраўлення аховы правапарадку ЎУС Магілёўскага аблвыканкама Ўладзімір Котаў. — На кухні, акрамя звычайнай газавай пліты, стаяла некалькі невялікіх электрычных. Вакол — бочкі, каністры, 40 – літровыя бітоны з «гатовай прадукцыяй»...

Самагонныя апараты канфіскавалі, прадукцыю знішчылі. Але за выраб спіртнога ў хатніх умовах закон сёння не карае, толькі за рэалізацыю. Калі падчас расследавання будзе ўсталявана, што бабруйчанін гандляваў алкаголем, яму пагражае штраф да 20 базавых велічынь.

ГОРКІ

## СЛАВА ГЕРОЯМ

Увечары на Дзень Волі ў парку сельгасакадэміі, дзе знаходзіцца надмагілле Войцеха Дамарацкага, аднаго з удзельнікаў паўстання пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, адбылося ўшанаванне памяці змагароў 1863 года. Прысутныя Горацкія актывісты ўсклалі кветкі. Многія былі з бел-чырвона-белымі сцягамі і сцягамі Еўрасаюзу.

# “Рабіце так, як робяць у ЗША”

Незапатрабаванасьць прадукцыі прадпрыемстваў Магілёўшчыны застаецца асноўнай праблемай рэгіянальнай эканомікі. Старшыня Магілёўскага аблвыканкаму Пётар Руднік вінаваціць прамыслоўцаў у бязьдзейнасьці й патрабуе, каб яны зьмяншалі кошты на заляжалую прадукцыю.

Паводле афіцыйнай інфармацыі, на складах прадпрыемстваў Магілёўшчыныназапашана прадукцыі больш як на 760 мільярдаў рублёў. Экспарт зьнізіўся на сорак мільёнаў даляраў. За апошнія два месяцы істотна скараціліся паступленьні ў бюджэт рэгіёну. Кіраўніцтва аблвыканкаму прызнае, што ёсьць праблемы з рэалізацыяй сацыяльных праграмаў, фінансаваньнем бюджэтнай сфэры й выплатай заробкаў.

Кіраўнікі прадпрыемстваў, заяўляе Пётар Руднік, прыкладаюць недастаткова намаганьняў, каб адолець наступствы крызісу:

“Спадзяюцца на тое, што крызіс у 2009 годзе, ну ў 2010 годзе, урэшце скончыцца. І потым, пасьля гэтага, яны будуць працаваць далей. Дык вось, ён ня скончыцца”.

Што ж прапануе кіраўнік аблвыканкаму?

“Бярыце за аснову тое, што сёньня робіцца ў Злучаных Штатах па распродажы. Тады за гэтымі шкарпэткамі й шторамі прыбягуць з Расеі й павязуць іх у Расейскую Фэдэрацыю. Тады ў вас будуць паказьнікі й прадпрыемствы будуць працаваць. Езьдзяць у Хмяльніцкі, ва Ўкраіну па тавар гэтак званы. А я хачу, каб езьдзілі сёньня ў Магілёўскую вобласьць”.

Ці слушна вінаваціць толькі адных прамыслоўцаў у сытуацыі, якая склалася ў рэгіянальнай эканоміцы? Эканаміст Пётар Мігурскі лічыць, што гэта несправядліва:

- Ад іх патрабавалі: дай валавую прадукцыю — яны гналі гэту валавую прадукцыю. Гэта дзяржаўная палітыка. Можа, сёньня столькі ж часу й фінансавых рэсурсаў выдзеліць менавіта на разьвіцьцё малога й сярэдняга бізнэсу? Можа, людзям узьняць выплаты па беспрацоўі? Можа, даць магчымасьць прадпрыемствам скінуць зь сябе лішнюю працоўную сілу?.

- Што чакае рэгіянальную эканоміку ў бліжэйшай пэрспэктыве?

- Пакупніцкая здольнасьць насельніцтва рэзка зьнізілася, рынкі збыту ўнутры краіны й зьнешнія рынкі збыту шмат у чым страчаныя, таму затаваранасьць складоў будзе працягвацца. Сытуацыя будзе пагаршацца.

*Радыё Свабода (Магілёў)*

КАМЭНТАР РАДАКТАРА

## ПЛЯН ПА ВАЛУ

Божачкі! Хто намі кіруе! Ніколі не сумляваўся, што людзі, якія прызначаюцца на вышэйшыя пасады, ў Беларусі адбіраюцца ніяк не па дзелавых якасьцях, але каб настолькі!.. Чытаеш словы старшыні абалвыканкаму і дзівісься – ну ня сорамна ж чалавеку паказваць сваю беспісьменнасьць!

“Бярыце за аснову тое, што робіцца ў Штатах”

Вы каму гэта кажаце, спадар старшыня? Дырэктару завода, які заціснуты тонамі супярэчлівых паперак зьверху, ды ордамі кантралераў-дармаедаў? Каб неяк апраўдаць уласнае існаваньне, тыя з жывога зь яго ня зьлезуць, калі не напішуць “абвінавачвальны акт праверкі”. Зрабіць гэта зараз вельмі проста – усе загады, інструкцыі, камэнтарыі да інструкцыяў, папраўкі да камэнтарыяў, тлумачэньні да загадаў ды інструкцыі да тлумачэньняў, якія на фоне усеагульнага развалу эканомікі у паніцы тысячамі штодзень “спускаюць” зьверху шматлікія “грамацеі”, выканаць немагчыма па азначэньні. Ды калі й выканаеш – то хутчэй за ўсе будзе яшчэ горш. Бо робяцца гэтыя “указіўкі” з асноўнай мэтаю – адвесьці пагрозу ад уласнага крэсла, ды па вядомым “прынцыпу куратніка” перавесьці стрэлкі на іньшага.

Думаеце, Вы першы на Магілеўшчыне, хто дае такія парады? Не-а. Прадаваць танна, каб забясьпечыць хоць нейкія грошы сеньня (а там – хоць патоп), паспрабавалі, напрыклад, у Горках - яшчэ напачатку стагодзьдзя. Тады у модзе была інтэграцыя. І тагачасны старшыня райвыканкаму У.С.Далжанкоў надта хваліўся тым, што мясцовы Завод напояў зьінтэграваўся з вельмі крутою фірмаю зь Піцера. Ня ведаю дзе той Далжанкоў зараз, але знайдзіце яго, ды запытайце, як яно там было.

Думаю, што Ўладзімер Сідаравіч распавядзе Вам, чаму кіраўніцтва завода прадавала ў Расею выробленыя цукеркі… таньнней за сабекошт. Здаецца, на 10%, калі не памыляюся. Піцерцы тады ахвотна за імі, як Вы кажаце, “беглі” ды везьлі ў Расею, дзе, напэўна, нядрэнна “наварыліся”. Пра Далжанкова ня ведаю – ен у хуткім часе пайшоў на павышэньне. А вось завод “заробіў” банкруцтва. Каля ста чалавек страцілі працу, а бюджэт – падаткаплацельшчыка.

А можа Вы кажаце гэта прадпрымальнікам, падаткі для якіх растуць ледзьве не штомесячна? Яны й так амаль банкруты, а ім усе раяць кошты зьніжаць. А жыць на што? Ды й Вас карміць трэба. Заробкі плаціць, “Мэрсэдэсы” службовыя запраўляць…

А можа лепей сказаць пра Штаты сабе самому? Узгадаўшы пры гэтым, што на распродажах па сымбалічнаму кошту там рэалізуецца не ЎСЁ, што вырабляе прамысловасьць, а нейкія рэшткі, колькасьць якіх на аб’ёмы рэалізацыі прадукцыі амаль не ўплывае. Асноўная ж маса выробленых тавараў прадаецца з прыбыткам, што абумоўлена іх якасьцю і запатрабаванасьцю. Бо там працуе ЭКАНОМІКА і прадпрыемствы вырабляюць ТАВАР, а не ПЛЯН ПА ВАЛУ. І начальніцкія Цэ-У наконт таго што вырабляць і як прадаваць, там не праходзяць. Таму, калі прыпячэ (а прыпякае чамусьці, нягледзячы на мудрае кіраўніцтва, ўсё часьцей і часьцей) аглядаемся мы на іх, а не яны на нас. Ды й аглядацца трэба яшчэ ўмець, каб бачыць ня толькі ШТО, але й ЯК,

Дзіўна, што кіраўнік нашае вобласьці такіх, здаецца, элемэнтарных рэчаў не разумее.

*Эдуард БРОКАРАЎ*

# В Бобруйске очень остро не хватает идеологов

Состав идеологического "бомонда" города все больше напоминает стареющее Политбюро: 53 процента – люди пенсионного либо предпенсионного возраста.

Нехватка кадров на идеологическом фронте в городе ощущается остро.

Даже в отделе идеологической работы администрации Первомайского района нет руководителя.

Несмотря на приличную зарплату, представители младшего поколения не сильно стремятся на такие должности.

– Собачья это работа, – делится наболевшим Оксана, отвечающая по службе за идеологическую работу в одном из учреждений. – Ты все время крайний получаешься. Постоянно нужно объяснять людям, как о нас заботится президент. Семьдесят раз вытерпят, а потом ведь и плюнуть норовят. Кому же этого хочется?

Вполне возможно, что возраст в таком тонком деле, как идеология, значения не имеет. Все же главные успехи бобруйских особо идейных товарищей сосредоточены в области работы с молодежью. Об этом было заявлено на недавнем совещании актива города.

У молодого бобруйчанина Андрея, работающего на шинном комбинате, свое мнение:

– Просто на молодежи "сидят" больше организаций, которые должны отчитаться наверх. К дискотеке, например, можно пристегнуть любой лозунг – хоть против наркотиков, хоть за здоровый секс. Ученики и студенты – люди подневольные. А куда и как вовлечь сорокалетних, чтобы те не послали далеко?

Лучшим средством для оздоровления морально-психологического климата в трудовых коллективах и социально-политической ситуации в городе пенсионеры от идеологии выбрали выездные семинары.

Именно эту форму на совещании идеологического актива города предложил в качестве основной на 2009 год своим коллегам начальник идеологического отдела горисполкома Александр Маркачев.

Почему? Да все очень просто: работать в кругу своих – совсем иное, нежели с народом. И не так страшно, и безопаснее...

*Надежда ЛИСОВСКАЯ*

## ДЕВУШКА УДАРИЛА НОЖОМ ТАКСИСТА, ПОПРОСИВШЕГО ЕЕ НЕ КУРИТЬ

Дело по ст. 147 Уголовного кодекса (умышленное причинение тяжкого телесного повреждения) возбуждено в отношении ранее судимой за такое же преступление 22-летней могилевчанки.

Как сообщил БелаПАН начальник отделения информации и общественных связей УВД Могилевского облисполкома Роман Посохов, инцидент произошел 17 марта. Девушка с двумя друзьями ехала в такси из Чаусов в деревню Загоринка Чаусского района. Когда пассажирка закурила, водитель попросил ее этого не делать. Девушка отказалась.

Водитель остановил машину и потребовал ее покинуть. Выйдя из автомобиля, пассажирка достала из сумки нож и ранила мужчину в живот. Затем вместе с друзьями, не принимавшими участия в ссоре, покинула место преступления.

Несмотря на ранение, водитель сумел самостоятельно добраться до больницы в райцентре. В Загоринку выехала следственно оперативная группа, которая и задержала девушку. Ее друзья оформлены как свидетели.

Подозреваемая, отметил Роман Посохов, будет заключена под стражу.


БЕЛСАТ tv BELSAT

Белсат TV – тваё права выбару!
Спадарожнікі «SIRIUS» (пазіцыя 5°E, палярызацыя H, частата 12 379,6 МГц) і «Astra 1 Kr» (пазіцыя 19,2° E, палярызацыя H, частата 10773 МГц)
http://www.belsat.eu/

Выбар №48 САКАВІК 2009

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны рэдактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй рэдакцыі. Рэдакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнай раклямы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.